РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
23 КРАСАВІКА 2025 г. СЕРАДА № 79 (30467)

# «УСЯ КРАІНА БУДЗЕ КАПІРАВАЦЬ ГЭТЫ ДОСВЕД»

**Якая звышзадача пастаўлена Прэзідэнтам перад Шклоўскім раёнам**

(Працяг на стар. 2–3)

# АСІЛАК. ІНТЭЛЕКТУАЛ. БЕЛАЗ

**Як ствараюць кар'ерныя самазвалы, што сталі сімвалам Беларусі**








Пабываць у цэхах БЕЛАЗа мне хацелася даўно: дзяўчаты ўсіх узростаў любяць вялікія, магутныя машыны. Фатаграфавацца каля іх (у Instagram мноства фота прыгажунь побач з вялікімі машынамі — часцей чужымі, але часам і ўласнымі). Кіраваць імі. А некаторым жанчынам даспадобы нават іх рабіць (але пра гэта — пазней). Ну, а апафеоз сілы і моцы — гэта, вядома ж, БЕЛАЗ, наша нацыянальная каштоўнасць і адзін з сімвалаў сучаснай Беларусі.

СТАР. 6–7

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ТРЭБА СКАЗАЦЬ ДЗЯКУЙ ЗА ЖЫЦЦЁ



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

РЫНАК ПРАЦЫ

## АД ФРЭЗЕРОЎШЧЫКА ДА ПІЛОТА

**У сталіцы прайшоў кірмаш вакансій**



Учора ў культурна-спартыўным цэнтры Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі адбыўся гарадскі кірмаш вакансій. У ім узяло ўдзел каля 110 наймальнікаў — вядучых прадпрыемстваў сталіцы ў сферы прамысловасці, гандлю, будаўніцтва, транспарту і інш. Яны прапанавалі каля 10 тысяч вакансій па больш чым тысячы прафесій і пасад — ад камандзіра паветранага судна і менеджара па турызме да санітаркі і прыбіральшчыка памяшканняў. Каля 30 наймальнікаў прапанавалі вакансіі для моладзі: ад падлеткаў 14—18 гадоў для занятасці ў вольны ад вучобы час да працаўладкавання маладых спецыялістаў.

СТАР. 11

# «УСЯ КРАІНА БУДЗЕ КАПІРАВАЦЬ ГЭТЫ ДОСВЕД»

## Якая звышзадача пастаўлена Прэзідэнтам перад Шклоўскім раёнам

Працягваецца камандзіроўка Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў рэгіёны. У аўторак кіраўнік дзяржавы працаваў на Магілёўшчыне, а дакладней, у Шклове. Беларускі лідар паставіў задачу зрабіць Шклоўскі раён узорна-паказальным, каб на яго раўняліся і іншыя раёны. І наведаў аб'екты, якія будуць гэтаму садзейнічаць.



### АГРАСЭРВІС. «БЕЗ ГЭТАЙ БАЗЫ РАЁН РАЗВІВАЦЦА НЕ МОЖА»

Першы аб'ект — аграсэрвіс. А канкрэтна, пляцоўка, дзе ён будзе дзейнічаць. Цяпер тут поўным ходам ідзе маштабная рэканструкцыя: старыя будынкі, якія ўжо ў аварыйным стане, зносяць, каб на іх месцы ўзвесці новыя сучасныя збудаванні. Тут будуць створаны неабходныя ўмовы для рамонту ўсёй лінейкі сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання. Тэрмін — да лістапада гэтага года, якраз да заканчэння сельскагаспадарчага сезона. А ўжо ў снежні, па словах кіраўніка дзяржавы, сістэма павінна працаваць на ўсю моц.

Мясцовыя ўлады запэўніваюць, што парадак будзе наведзены поўнасцю і ў адпаведнасці з планам. «Спачатку намалявалі тэхналогію, а потым на яе «нанізвалі» пабудовы. Мы не пад пабудову падстройваліся», — удакладніў кіраўнік спраў Прэзідэнта Юрый Назараў. Тут будуць магчымыя ўсе рамонтныя работы, у тым ліку і рамонт вузлоў і іншых камплектуючых не толькі айчыннай, але і імпартнай тэхнікі. Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што, калі ўжо ўзяліся за гэту справу, трэба наводзіць ідэальны парадак у кожным куточку.

І яшчэ адзін важны момант. Аграсэрвіс належыць холдынгу «Купалаўскае» — самаму вялікаму сельскагаспадарчаму прадпрыемству ў Шклоўскім раёне.

**Прэзідэнт засяродзіў увагу на тым, што аграсэрвіс павінен працаваць на ўвесь раён. І паставіў задачу старшыні Шклоўскага райвыканкама Сяргею Барташу кантраляваць гэта пытанне, сачыць за кадрамі і цэнамі, унікаць ва ўсе аспекты дзейнасці райаграсэрвісу. «Твая задача — быць крытыкам, але не тармазіць працэс», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.**

**Ён зрабіў акцэнт на тым, што падобныя райаграсэрвісы павінны быць у кожным раёне. Сэрвіснае абслугоўванне тэхнікі, дапільных апаратаў, разнастайных камплектуючых патрэбна ўсім. Без гэтай базы, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, раён развівацца не можа.**

«Усё трэба прыводзіць у парадак. Калі ўжо прыйшлі сюды, значыць, трэба прыводзіць у парадак», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Неаднаразова было сказана, што Беларусь будзе развівацца за кошт рэгіёнаў, нагадаў Прэзідэнт. У краіне 118 раёнаў. «Іх трэба прывесці ў парадак, рэанімаваць. Сёлета тут зробім. І вельмі важна — па ўсёй Беларусі будзем з гэтага ўзору рабіць», — заявіў ён.

**Аляксандр Лукашэнка таксама растлумачыў, чаму гэта мадэрнізацыя і рэанімацыя пачынаецца менавіта са Шклоўскага раёна. «Я тут ведаю кожны метр. І тут цяп-ляп не атрымаецца. Чаму не атрымаецца і не патрэбна, каб атрымалася, я ўжо сказаў: уся краіна будзе капіраваць гэты досвед. Нам трэба аднавіць былыя сельгастэхнікі. Не можа раён развівацца без гэтай базы», — адзначыў ён.**

«Усюды павінен быць гэты рух. Усюды. Асабліва ў Магілёўскай вобласці, калі пачалі ўжо тут рабіць», — падсумаваў Прэзідэнт.





## КАМБІКОРМАВЫ ЗАВОД. «КАБ БЫЛІ НАРМАЛЬНЫЯ НАДОІ І ПРЫВАГІ»

Наступны пункт прэзідэнцкага маршруту — камбікормавы завод, які сёння перажывае рэканструкцыю. Усе аб'екты абяцаюць увесці ў строй ужо сёлета, да новага ўраджаю. Прадпрыемства таксама адносіцца да «Купалаўскага», але мае вялікае значэнне не толькі для Шклоўскага раёна, але і для ўсёй Магілёўскай вобласці.

**«У Магілёўскай вобласці трэба спыняць гэтыя разбоі і спыняць карміць зернем жывёлу», — падкрэсліў Прэзідэнт. Само па сабе зерне ў якасці корму не мае ніякай каштоўнасці для арганізма жывёлы. «Неабходна рыхтаваць камбікармы для таго, каб былі нармальныя надоі і прывагі. Таму проста трэба забараніць выкарыстоўваць зерне», — заявіў кіраўнік дзяржавы. І звярнуў увагу, што для таго, каб забароны працавалі, цэнаўтварэнне павінна быць такім, каб сельскагаспадарчым прадпрыемствам было выгадна здаваць сваё зерне на камбікормавы завод для вытворчасці камбікармоў.**





«Мэта — не загубіць прадпрыемства, каб яно рэнтабельным было. І не адбіць жаданне ў кіраўнікоў рабіць камбікорм», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

Асобную ўвагу кіраўнік дзяржавы звярнуў на тэрыторыю, дзе размяшчалася мэблевая фабрыка, — прыватны ўласнік там не спрацаваў.

**Аляксандр Лукашэнка параіў прыглядзецца да вопыту стварэння тэхнапаркаў, каб задзейнічаць у вытворчасці тыя памяшканні, што ўжо ёсць. «Падзяліць будынак так, як інвестары захочуць. Прывесці ў парадак і здаць яго — адзін з варыянтаў. Гэта павінна быць па-гаспадарску, капітальна, каб людзі працавалі, плацілі падаткі і зарплату тым, хто там будзе працаваць, — прапанаваў ён. — Усё трэба рэанімаваць, усё павінна быць задзейнічана, каб ніводнага недагледжанага кавалачка да новага года».**

Для таго, каб людзі працавалі на гэтых прадпрыемствах і былі задаволеныя, ім патрэбна жыллё. І тут зноў паўстала пытанне арэнднага жылля, якое абмяркоўвалася напярэдадні. Тым больш што месца для будаўніцтва жылля ў Шклове ёсць.

**У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка паўтарыў свой тэзіс, які агучваў не раз, — будаваць не ў Мінску і не сцягваць туды людзей, а ў рэгіёнах.**

Мясцовыя кіраўнікі заўважылі, што шмат маладых людзей хацелі б жыць у Шклове. «А чаго не хацець? Выдатнае месца, горад добры. Вось такім чынам будзем жыллё будаваць найперш пад патрэбы вытворчасці. Пад тое, што дае грошы, — арэнднае жыллё», — падсумаваў беларускі лідар. І зарыентаваў на тое, што тэмпы будаўніцтва павінны быць максімальна хуткімі, наколькі гэта магчыма.

**«Нічога не рабіце цяп-ляп. Нічога не рабіце часовага, — параіў усім Прэзідэнт. — Калі сёння трэба зрабіць нешта, не пакідайце недаробкі. Часовае — самае доўгае».**

## МАЛАКАЗАВОД. «УСЁ ТУТ ПЕРАПРАЦУЕМ»

Трэці пункт на маршруце — пляцоўка, дзе будуецца малаказавод. Плануецца, што вытворчая магутнасць прадпрыемства будзе дасягаць 300 тон малака ў суткі — сыравіны хапае. Абяцаюць пабудаваць да канца 2026 года.

**«Калі ўзяліся за гэту тэрыторыю, яна павінна быць абстаявана і добраўпарадкавана. Абавязкова», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.**







Цяпер у Шклове ўжо ёсць малакаперапрацоўчае прадпрыемства — Шклоўскі масларобны завод, дзе штодзень перапрацоўваецца 100 тон малака. У асноўным вырабляецца натуральнамалочная прадукцыя. Аляксандр Лукашэнка даручыў вырашыць, што рабіць з гэтай пляцоўкай пасля ўвядзення ў строй новай вытворчасці. «Цяпер не трэба чапаць, няхай працуюць. Як толькі мы пераходзім сюды ў 2026 годзе, ніякіх двух заводаў быць не можа. Усё малако мы тут перапрацуем», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на некаторыя кропкавыя пытанні. У Сяргея Барташа пацікавіўся, як справы з выканальніцкай дысцыплінай у раёне. Старшыня райвыканкама запэўніў, што ўсё ў парадку. «Ты ж разумееш, што без цябе тут ні адна мыш не павінна праскочыць. Кантралюй кадры», — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка. Пацікавіўся, канешне, і справай на палях. Прэзідэнт настойвае на тым, што галоўнае — культура земляробства.

Агучыў Аляксандр Лукашэнка і некалькі цікавых інсайдаў. Былы міністр сельскай гаспадаркі адпраўляецца працаваць на афрыканскім напрамку. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ён справіцца.

**Прэзідэнт анансаваў і хуткую нараду на сваім узроўні па развіцці Віцебскай вобласці, падрыхтоўка да яе ўжо ідзе. А журналістаў беларускі лідар папярэдзіў: на развіццё раёнаў зараз будзе звернута асаблівая пільная ўвага.**

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**
*г. Шклоў.*

**Афіцыйна**

## СПАЧУВАННІ АД ПРЭЗІДЭНТА

Учора ў Мінску ў Апостальскай нунцыятуры прымалі спачуванні з нагоды смерці Папы Рымскага Францыска. Паколькі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка знаходзіўся ў рабочай камандзіроўцы, паднесці карзіну з кветкамі і пакінуць запіс у кнізе спачуванняў было даручана кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрыю Крутому. «Жыццёвы шлях пантыфіка — яркі прыклад самаахвярнага служэння царкве і людзям, прасоўвання прынцыпаў справядлівасці, дабра і міру», — напісаў ён ад імя кіраўніка дзяржавы.

* * *

Яшчэ адна сумная вестка, гэтым разам з Расіі, — памёр вядомы скульптар Зураб Цэрэтэлі. Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне родным і блізкім народнага мастака СССР. «Пайшоў з жыцця незвычайна таленавіты чалавек, прафесійная дзейнасць якога — прыклад адданага служэння мастацтву. Створаныя майстрам маштабныя творы ўражваюць смеласцю думкі і дасканалай тэхнікай выканання. Творчасць Зураба Канстанцінавіча пераадольвала межы і адлегласці, садзейнічала ўмацаванню духоўных і культурных сувязей паміж народамі. Светлая памяць аб ім заўсёды будзе жыць у нашых сэрцах», — гаворыцца ў спачуванні.



Удзельнікі выязнога пасяджэння наведалі мемарыяльны комплекс «Дзецям – ахвярам вайны», усклалі кветкі. Наталля Качанава пакінула запіс у кнізе ганаровых гасцей.

Фота БелТА.

НА КАНТРОЛІ

# «КОЖНЫ МЕТР ЗЯМЛІ ПАВІНЕН ВЫКАРЫСТОЎВАЦЦА ЭФЕКТЫЎНА»

## Выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі прайшло ў Жлобінскім раёне

Адной з тэм пасяджэння стала сумесная работа дзяржаўных органаў па ўключэнні ў гаспадарчы абарот зямельных участкаў, навядзенні парадку на зямлі, меліярацыі і эфектыўным выкарыстанні зямель. Сярод запрошаных на пасяджэнне — члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі міністэрстваў эканомікі, энергетыкі, сельскай гаспадаркі і харчавання, архітэктуры і будаўніцтва, Дзяржаўнага камітэта па маёмасці і мясцовых органаў улады.

### «ЧЫСЦІНЯ І ПАРАДАК — ГЭТА БРЭНД НАШАЙ КРАІНЫ»

Як акцэнтавала ўвагу **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** задачы ў гэтым кірунку стаяць сёння перад усімі. «Пачынаючы ад рэспубліканскіх органаў улады і заканчваючы грамадзянамі краіны, — удакладніла спікер. — Каб зрабіць нашу краіну яшчэ больш чыстай, добраўпарадкаванай, прыгожай, — так, як гаворыць аб гэтым Прэзідэнт».

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на важнасць аператыўнага і якаснага ўключэння ў гаспадарчы абарот зямельных участкаў, якія заняты пустымі жылымі дамамі, фарміравання пералікаў свабодных зямельных участкаў, у тым ліку і для наступных аўкцыёнаў. Яшчэ адзін кірунак у цэнтры пастаяннай увагі — уключэнне ў гаспадарчы абарот зямель, якія вызваліліся пасля зносу непрыдатных і неэксплуатаваных будынкаў, збудаванняў сельскагаспадарчых арганізацый, а таксама эфектыўнае выкарыстанне меліяраваных зямель.

Па словах Наталлі Качанавай, у гэтых кірунках павінна весціся эфектыўная работа. «І вельмі важны вынік, — падкрэсліла яна. — Таму мы павінны зрабіць усё, што залежыць ад нас, каб у Год добраўпарадкавання ўсе запланаваныя мерапрыемствы былі выкананы. Каб работа, якая датычыцца пустых дамоў, зямель, што не выкарыстоўваюцца, меліярацыі зямель, навядзення парадку, была праведзена на высокім, якасным узроўні».

Старшыня Савета Рэспублікі канстатавала, што задачы, якія датычацца добраўпарадкавання, навядзення парадку, Прэзідэнт ставіць ужо на працягу 20 гадоў. «І вынікі мы бачым: чысціня і парадак — гэта брэнд нашай краіны, — адзначыла спікер. — Але мы павінны разумець, што кожны метр зямлі павінен выкарыстоўвацца эфектыўна. Гэта наша багацце».

### «ГЭТА ТЫЯ ЗЕМЛІ І БУДЫНКІ, ЯКІЯ ПАВІННЫ ЎТРЫМЛІВАЦЦА Ў ПАРАДКУ»

Як падкрэсліла Наталля Качанава, пытанні, вынесеныя на парадак дня, актуальныя і вынікаюць з тых прапаноў і зваротаў, з якімі людзі прыходзяць на прыём і якія неабходна ўрэгуляваць. У ліку пытанняў, з якімі звяртаюцца прадстаўнікі садаводчых таварыстваў (СТ), — правядзенне сходаў для прыняцця рашэнняў, эфектыўнасць дзейнасці кіруючага складу СТ, прапіска, функцыянаванне інжынерных камунікацый.

Абмяркоўваючы праблемныя пытанні дзейнасці садаводчых таварыстваў і шляхі іх вырашэння, спікер заўважыла, што апошнім часам пачасціліся звароты па пытанні іх функцыянавання. «Такая тэндэнцыя, на жаль, была ў мінулым годзе, — канстатавала яна. — І за гэты год толькі ў Савет Рэспублікі паступіла каля 40 зваротаў аб дзейнасці садаводчых таварыстваў. Хоць у 2023-м прыняты ўказ Прэзідэнта, у якім ужо ўрэгуляваны пытанні па гэтай тэме, што хвалююць нашых грамадзян».

Спікер прывяла лічбу: у краіне 4728 садаводчых таварыстваў. «Гэта тыя землі і будынкі, якія павінны ўтрымлівацца ў парадку», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Гаворачы аб тым, якія пытанні па тэме садаводчых таварыстваў выходзяць на першы план, Наталля Качанава адзначыла: перш-наперш гэта правядзенне сходаў. З-за вялікай колькасці членаў садаводчага таварыства, па яе словах, цяжка сабраць кворум і прыняць рашэнне.

«Другое пытанне — выбранне старшыні, кіруючага складу таварыстваў, — канкрэтызавала спікер. — Многія гавораць аб іх неэфектыўнай рабоце. Таму мы павінны яшчэ раз вярнуцца да гэтай тэмы. І мясцовыя органы ўлады павінны ўключацца ў вырашэнне пытанняў дзейнасці СТ, калі не атрымліваецца вырашыць гэта пытанне ў самім таварыстве».

Спікер звярнула ўвагу на асаблівую ролю старшыняў сельскіх выканаўчых камітэтаў у гэтых пытаннях. «Гэта і ваша работа, паколькі вы першымі сутракаецеся з такімі зваротамі, бо, як правіла, садаводчыя таварыствы ў нас знаходзяцца ў сельскай мясцовасці», — канстатавала Наталля Качанава.

Рэзюмуючы, Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што ў цэлым пытанне няпростае. «Пачынаецца сезон, людзі працуюць ужо на лецішчах, — патлумачыла яна. — І таварыства — гэта аб'яднанне, дзе па сутнасці жывуць людзі. Дзейнасць таварыстваў уласнікаў дамоў мы ўрэгулявалі. Прыняты ўсе законы. І на прыкладзе такіх таварыстваў уласнікаў давайце паглядзім пытанні, якія выходзяць на парадак дня (адносна садаводчых таварыстваў. — **«Зв.»**) і якія хвалююць нашых грамадзян».

**Паводле БелТА.**

ВЕКАПОМНАЕ

# «НЕ ЛОЗУНГАМІ, НЕ ЗАКЛІКАМІ, А КАНКРЭТНЫМІ СПРАВАМІ»

## У Мінску прэзентавалі кнігу «Невядомыя старонкі вайны адкрываюць дэпутаты беларускага Парламента»



Фота БелТА.

Кніга падрыхтавана і выдадзена па ініцыятыве членаў пярвічнай арганізацыі Палаты прадстаўнікоў Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Пад адной вокладкай сабраны матэрыялы аб франтавіках — родных і блізкіх дэпутатаў і супрацоўнікаў Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў, жыхарах выбарчых акруг. Тут прадстаўлены і дэталі некаторых падзей Вялікай Айчыннай вайны.

### «ПАТРЫЁТА ТРЭБА ВЫХАВАЦЬ»

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** лічыць сімвалічным тое, што прэзентацыя кнігі, якую падрыхтавалі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, супрацоўнікі Сакратарыята, праводзіцца ў абноўленым кінатэатры «Перамога» ў беларускай сталіцы. «Гэта першы кінатэатр, які быў адноўлены ў 1950 годзе ў вызваленым Мінску пасля кровапралітнай вайны, — падкрэсліў ён. — І мэта нашай далейшай работы — знайсці новыя, можа быць, не зусім вядомыя старонкі гісторыі канкрэтных людзей, канкрэтных сваякоў, канкрэтных землякоў, аднавяскоўцаў. Новыя факты, якія захоўваліся ў сем'ях у выглядзе дакументаў, у выглядзе ўспамінаў, сёння знайшлі адлюстраванне на старонках кнігі».

Выданне, на думку спікера, будзе карысным для многіх жыхароў нашай краіны. «Асабліва для тых, пра каго ідзе гаворка ў гэтай кнізе, — канкрэтызаваў Ігар Сергяенка. — Асабліва важна сёння для нашай моладзі даведвацца пра гэтыя новыя старонкі, паколькі памяць аб Вялікай Айчыннай вайне святая. Сёння нельга навучыць патрыятызму. Патрыёта трэба выхаваць. Не лозунгамі, не заклікамі, а канкрэтнымі справамі, працуючы на карысць роднай краіны, захоўваючы гістарычную памяць, адкрываючы новыя старонкі, якія характарызуюць работу чалавека — франтавіка, партызана, які сваім унёскам набліжаў Вялікую Перамогу».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў заўважыў, што беларускіх парламентарыяў ніколькі не непакоіць тое, што іх не запрашаюць на мерапрыемствы ў Еўропу, што там не праводзяць мерапрыемствы ў гонар Перамогі. «Запрашэнне на гэту Перамогу нам далі нашы дзяды і прадзеды, заваяваўшы яе», — падкрэсліў спікер.

### ГІСТОРЫІ ПОДЗВІГУ

**Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Ірына АСТАПЕНКА**, якая з'яўляецца аўтарам ідэі кнігі, расказала, у чым унікальнасць выдання: дэпутаты распавядаюць аб жыхарах сваіх акруг, у якіх яны актыўна працуюць. «Аб сваіх блізкіх, сваяках, якія ваявалі, расказалі і супрацоўнікі Сакратарыята, — удакладніла Ірына Астапенка. — Захоўваць гісторыю вельмі важна для нас дзеля таго, каб ніхто не асмеліўся перапісаць гісторыю Вялікай Перамогі».

У кнізе — і гісторыя баявога шляху дзядулі **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Ірыны ДАЎГАЛЫ.** «Мой дзед, Павел Васільевіч Хацько, пачаў работу ў Лепельскім падполлі практычна з самага пачатку вайны. Удзельнікі Лепельскага падполля пусцілі пад адхон сотні эшалонаў. Дзед быў удастоены баявых узнагарод, аб чым мы даведаліся дзякуючы базе «Партызаны Беларусі», — расказала дэпутат.

Гісторыяй сваёй сям'і з чытачамі кнігі падзяліўся і **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Андрэй ЛІС.** «Выдатная ідэя, увасобленая ў жыццё, дазволіла ўвекавечыць памяць у тым ліку і майго дзеда Ліса Васіля Арцёмавіча, які ў 1944 годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію, прайшоў вайну да Берліна, узнагароджаны двума медалямі «За адвагу», — расказаў дэпутат. — Прычым яму адначасова былі ўручаны гэтыя ўзнагароды. Я доўга аднаўляў падзеі, звяртаўся ў архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, каб усё ж даведацца, што здзейсніў мой дзед, за што быў ганараваны такімі высокімі ўзнагародамі. Адна з іх была атрымана за баі пры фарсіраванні ракі Одэр, а другі медаль «За адвагу» быў уручаны ўжо непасрэдна за ўдзел у баях у Берліне».

Дэпутат канстатаваў, што ўдзельнікаў вайны засталося вельмі нямнат. «Я карыстаюся кожным імгненнем, магчымасцю сустрэцца яшчэ з жывымі ўдзельнікамі баявых бітваў, убачыць іх і пачуць з першых вуснаў, якой цаной далася Вялікая Перамога», — падзяліўся Андрэй Ліс.

**Вераніка КАНЮТА.**

АНОНС

# УМАЦОЎВАЕМ СУПРАЦОЎНІЦТВА З КЛЮЧАВЫМІ ПАРТНЁРАМІ

## Урадавая дэлегацыя пад кіраўніцтвам Прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына сёння адправіцца ў Татарстан

Напярэдадні візіту кіраўнік беларускага ўрада правёў нараду.

Чаму гэты візіт такі важны?

Татарстан — адзін са значных эканамічных партнёраў Беларусі сярод расійскіх рэгіёнаў, паколькі займае 9-е месца па тавараабароце і 8-е месца па аб'ёмах экспарту, растлумачылі ў прэс-службе Савета Міністраў.

Тут дадалі, што ў ліку асноўных мерапрыемстваў візіту — перагаворы Прэм'ер-міністра Беларусі з кіраўніком Татарстана Рустамам Мініханавым, падпісанне двухбаковых дакументаў і наведванне ключавых прамысловых прадпрыемстваў Набярэжных Чалноў, Ніжнякамска і Елабугі, якія цікавяць беларускі бок.

Якіх менавіта? Сярод аб'ектаў значацца ТАА «ТПК МТЗ-Татарстан», дзе Прэм'ер-міністр азнаёміцца з вытворчасцю і возьме ўдзел ва ўрачыстай перадачы 19 газавых трактароў і 20 грузавікоў МАЗ. Аляксандр Турчын таксама пабывае на ПАТ «КАМАЗ» з аглядам галоўнага зборачнага канвеера і навукова-тэхнічнага цэнтра, дзе ствараюць аўтаматычныя трансмісіі для аўтамабіляў КАМАЗ і Aurus. Пабывае Прэм'ер-міністр і на АТ «Танека», дзе таксама пазнаёміцца з дзейнасцю цэнтральнай аператарскай прадпрыемства і прадукцыяй, што выпускаецца ім.

АКТУАЛЬНА

# БЯСПЕКА І ПРАФІЛАКТЫКА

## Пра што ішла размова на пасяджэнні Камісіі па надзвычайных сітуацыях

У Доме ўрада ўчора прайшло пасяджэнне Камісіі па надзвычайных сітуацыях пад старшынствам намесніка Прэм'ер-міністра Анатоля Сівака.



На парадку дня былі пытанні, якія датычацца бяспекі кожнага, паведамілі ў прэс-службе Савета Міністраў. У ліку ключавых тэм для абмеркавання былі бяспека на вадзе і гатоўнасць да купальнага сезона, узмацненне абароны насельніцтва ад надзвычайных сітуацый, аналіз НС і як пазбегнуць іх паўтарэння.

Анатоль Сівак адзначыў, што эфектыўнасць рашэнняў, якія прымаюцца міністэрствамі і мясцовымі органамі ўлады, напрамую залежыць ад зладжанай работы ўсіх суб'ектаў прафілактыкі.

— Нямала зроблена па добраўпарадкаванні месцаў масавага адпачынку грамадзян каля вады і прывядзенні іх у адпаведнасць з патрабаваннямі правіл аховы жыцця людзей на водах. Сёння абмяркуем пытанне аб гатоўнасці да купальнага сезона і прынятых мерах па забеспячэнні бяспекі людзей, — задаў тон старшыня камісіі.

Па словах віцэ-прэм'ера, неабходна асаблівую ўвагу звярнуць на ўчасткі акваторый, прызначаныя для купання дзяцей, наладзіць дзейсны кантроль за выкананнем абмежаванняў купання ў забароненых месцах — крэйдавых кар'ерах, тэхнічных і меліярацыйных каналах, каля плацін і дамб.

— Гэта ж датычыцца і ўзмацнення абароны насельніцтва ад надзвычайных сітуацый, — акцэнтаваў увагу Анатоль Сівак.

УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ — 2025

# КАГО ПРЫМУЦЬ БЕЗ ІСПЫТАЎ?

## Чым прыцягнуць абітурыентаў рэгіянальныя ўстановы вышэйшай адукацыі

Народная мудрасць «дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся» сёння набывае асабліва актуальны сэнс. Прамысловасць, сельская гаспадарка, іншыя сферы жыццядзейнасці краіны ідуць па шляху ўстойлівага развіцця. Новыя прагрэсіўныя тэхналогіі ўкараняюцца і выкарыстоўваюцца ва ўсіх сферах эканомікі. І ўсё роўна, дзе размяшчаюцца арганізацыі гэтых сфер — у сталічным рэгіёне або правінцыі, — усюды патрэбныя спецыялісты адпаведнай кваліфікацыі. Нашы рэгіянальныя ВНУ робяць усё, каб сваіх, мясцовых прафесіяналаў на месцы рыхтавалі і ў сябе ж у рэгіёне працаўладкоўвалі.



Сёлета ў беларускія ВНУ плануецца залічыць 31,8 тысячы бюджэтнікаў — гэта на 400 месцаў больш, чым было летась. Ільготную траекторыю паступлення ў рэгіянальныя ўніверсітэты (залічэнне без уступных іспытаў) атрымаюць 1260 пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд. Медалісты, уладальнікі «чырвоных дыпломаў» каледжаў, пераможцы (дыпломы I, II, III ступені) трэцяга (абласнога, Мінскага гарадскога) этапа рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах таксама могуць паступаць у рэгіянальныя ВНУ без экзаменаў амаль на ўсе спецыяльнасці. Выключэнне складаюць толькі кірункі навучання з медыцынскім профілем, спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны», «Міжнароднае права», «Правазнаўства», «Эканамічнае права», «Дзяржаўнае кіраванне і права», «Усходазнаўства» і спецыяльнасці, дзе профільныя выпрабаванні — «Творчасць», «Фізічная культура і спорт».

Выпускнікі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка таксама маюць ільготы. Іх чакаюць і прымуць без экзаменаў на запатрабаваныя спецыяльнасці. Нагадаем, аднак, што для залічэння ва ўніверсітэт ім патрэбныя рэкамендацыя назіральнага савета дзіцячага тэхнапарка і паспяхова пройдзенае сумоўе ў выбраным універсітэце.

Выпускнікі пяці ліцэяў, якія створаны на базе БДУ, БНТУ, ВДУ імя П. М. Машэрава, Беларуска-Расійскага ўніверсітэта, Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, таксама атрымалі права паступаць у свае ВНУ без здачы экзаменаў. Але гэта ў тым выпадку, калі выкананыя важныя ўмовы: па профільных прадметах у атэстаце трэба мець адзнаку не ніжэй за 9 балаў, па іншых вучэбных дысцыплінах — ад 8 балаў і вышэй.

Сёлета ўпершыню выпускаюцца са школ вучні інжынерных класаў. Па словах **міністра адукацыі Андрэя ІВАНЦА,** выпускнікі гэтых класаў змогуць паступаць без экзаменаў у сталічныя і рэгіянальныя ВНУ на больш чым 70 спецыяльнасцяў.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | УП «Лаздуны-Агро», Гродненская обл., Ивьевский р-н, Лаздунский с/с, аг. Лаздуны 1, ул. Советская, д. 1. УНП 592001055 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронных торгов: бывшие в употреблении трактора**

| Лот № | Марка, модель | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| **1** | Трактор «Беларус 82.1», СК-4 6023, 2011 г. в. | **13 671,94** |
| **2** | Трактор «Беларус 82.1», СК-4 6040, 2006 г. в. | **12 672,64** |
| **3** | Трактор «Беларус 922.3», СВ-4 8002, 2012 г. в. | **16 065,14** |
| **4** | Трактор «Беларус 1221В», СК-4 6016, 2006 г. в. | **17 495,07** |

Начальная цена снижена на 20 %.
Шаг торгов – 5 % от текущей цены лота

Месторасположение – Гродненская обл., Ивьевский р-н:
лоты №№ 1, 2 – Ивьевский с/с, 21/1, в районе в г. Ивье,
лоты №№ 3, 4 – Эйгердовский с/с, 3, в районе д. Токаришки

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | 100 % от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение **10 рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи |

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение 6 % от итоговой цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.03.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 13.05.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 12.05.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные данные: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ООО «БЕССЕР-БЕЛ»** (Продавец)

Электронные торги состоятся 28.05.2025.
**Лот № 1 в составе:**

1. DAF TE95XF,
кузов (рама) XLRTE47XS0E639472, 2004 г. в.
2. KOEGEL SN24,
кузов (рама) WK0S0002400075923, 2006 г. в.

Начальная цена с НДС 20 % – 130 920,00 руб.
Задаток – 5 000,00 руб.
**Местонахождение:** г. Минск, ул. Монтажников, 21.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов, размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 26.05.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52;**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Организатор: **Государственное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска»,**
*220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, тел. +375173600685.*

Торги проводятся **23.05.2025 г.** на ЭТП «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by**

**Право заключения договора аренды на изолированное помещение с инв. № 500/С-32378, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Сухаревская, д. 1.**

Окончание приема заявлений – **20.05.2025, до 15.00.**
Подробная информация на сайте **www.et.butb.by**

УНП 192605364

МТБанк
Банк свежих решений

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**31 марта 2025 года**

Наименование банка:
Закрытое акционерное общество «МТБанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 31.03.2025 | 31.12.2024 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 311 886 | 384 294 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 5 342 | 4 953 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 583 897 | 511 188 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 497 366 | 457 480 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 151 329 | 147 611 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 2 893 271 | 2 763 764 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 1 456 | 1 456 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 123 189 | 118 247 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 65 | 115 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 42 042 | 55 532 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 4 609 843 | 4 444 640 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 133 984 | 121 382 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 3 524 819 | 3 425 559 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 222 815 | 189 303 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 61 706 | 64 691 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 3 943 324 | 3 800 935 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 175 628 | 65 598 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 284 555 | 122 131 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 18 570 | 19 947 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 187 766 | 436 029 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 666 519 | 643 705 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 4 609 843 | 4 444 640 |

**ОТЧЕТ**
**о прибылях и убытках**
**за период, начинающийся 1 января**
**и заканчивающийся 31 марта 2025 года**

Наименование банка:
Закрытое акционерное общество «МТБанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 31.03.2025 | 31.03.2024 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 96 272 | 66 841 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 57 696 | 29 443 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 38 576 | 37 398 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 61 494 | 51 971 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 24 688 | 20 356 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 36 806 | 31 615 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 478 | 396 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (675) | 425 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 17 499 | 12 589 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 0 | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 10 693 | 9 546 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 3 251 | 4 886 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 51 420 | 42 222 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 2 037 | 2 732 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 31 785 | 32 809 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 7 666 | 8 157 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 24 119 | 24 652 |

Председатель Правления Д.П. Шидлович

Главный бухгалтер Е.М. Грибанова

Дата подписания: 14 апреля 2025 г.

Адреса интернет-страниц сайта,
на которых размещена квартальная отчетность о деятельности Банка:
1. бухгалтерский баланс: https://www.mtbank.by/about/reporting/balance/
2. отчет о прибылях и убытках: https://www.mtbank.by/about/reporting/profit-loss/

УНП 100394906

# АСІЛАК. ІНТЭЛЕКТУАЛ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зрэшты, гэты асілак памерам з дом, з вышынёй колаў у два чалавечыя росты і грузападымальнасцю ў сотні тон не пакідае абыякавымі і мужчынскія сэрцы. Нядзіўна: буйнагабарытныя кар'ерныя самазвалы, ключавое звяно здабыўной прамысловасці, па праве называюць вяршыняй інжынернай думкі ў машынабудаванні. Каб даведацца, як ствараюцца шматтонныя БЕЛАЗы, мы накіраваліся ў Жодзіна.

## У АСАБЛІВА БУЙНЫМ ПАМЕРЫ

Пра БЕЛАЗ можна расказваць толькі з выкарыстаннем найвышэйшай ступені параўнання. Гэта ўнікальнае прадпрыемства — адзінае ў свеце, дзе такія машыны збіраюць канвеерным спосабам, — працуе ўжо 77 гадоў. Сёння холдынг БЕЛАЗ — гэта 11 прадпрыемстваў і філіялаў, больш за 14 тысяч высакакласных прафесіяналаў дзясяткаў спецыяльнасцяў, звыш 600 мадыфікацый кар'ернай тэхнікі, прыдатнай для работы ў суровых кліматычных умовах: ад лютых халадоў да экстрэмальнай спякоты. Гэта пастаўкі ў дзясяткі краін (БЕЛАЗы працуюць на ўсіх заселеных кантынентах планеты). Гэта самы вялікі ў свеце двухвосевы самазвал (БЕЛАЗ-75710 грузападымальнасцю 450 тон). І гэта сусветнае прызнанне, а таксама заслужаны аўтарытэт на радзіме — серыя тэхнікі 7513 удастоена Дзяржаўнага знака якасці.



— Знак якасці прысвоены кар'ерным самазвалам серыі 7513 грузападымальнасцю 130 тон, — кажа **генеральны канструктар — начальнік НТЦ імя А. М. Ягорава ААТ «БЕЛАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ» Аляксандр НАСКАВЕЦ**. — Гэта наша самая папулярная серыя. У залежнасці ад года мы ўтрымліваем у гэтым сегменце грузападымальнасці ад 70 да 80 % сусветнага рынку. Менавіта гэтымі машынамі мы ганарымся як творам мастацтва ў галіне цяжкага машынабудавання.

У сям'і БЕЛАЗаў 130-тоннікі — далёка не самыя вялікія машыны.

— Гэта сярэдняя грузападымальнасць у лінейцы машын, якія мы выпускаем, — тлумачыць Аляксандр Наскавец. — Яна найбольш запатрабаваная на тых рынках, дзе мы прысутнічаем.



**У партфелі холдынга — самыя розныя кар'ерныя самазвалы: ад «малеч» 30-, 45- і 55-60-тоннікаў да машын грузападымальнасцю 90, 110–140, 180, 220, 240, 290, 360 і 450 тон.**

— Выпускаем мы і іншую тэхніку. Франтальныя пагрузчыкі, колавыя бульдозеры, цягачы-буксіроўшчыкі, палівааарашальныя машыны, цяжкавозы і шлакавозы для металургічных прадпрыемстваў, аэрадромныя цягачы, — пералічвае суразмоўнік. — Цяпер асвойваем выпуск падземнай тэхнікі.

Адзін з ключавых кірункаў пры стварэнні тэхнікі на БЕЛАЗе — экалагічнасць, дадае генеральны канструктар.

— У прыярытэце выкарыстанне прыроднага газу, электраэнергіі і вадароду ў якасці паліва. Па газавых самазвалах гэта замяшчэнне часткі дызельнага паліва прыродным газам на нашым 130-тонным самазвале. Створана і чыста газавая лінейка самазвалаў грузападымальнасцю 90–130 тон. У планах у наступным годзе выпусціць 220-тонны кар'ерны самазвал, дзе ў якасці маторнага паліва будзе выкарыстоўвацца прыродны газ. Гэта вельмі папулярная лінейка, яна карыстаецца попытам у спажыўцоў, — падкрэслівае суразмоўнік.

Развіваюць канструктары БЕЛАЗа і два кірункі «электрычных» машын. У першую чаргу гаворка ідзе аб гібрыдных самазвалах, дзе ўстаноўлены рухавік меншай магутнасці і акумулятарныя батарэі, што дапаўняюць магутнасць, якое не хапае. У легкавым аўтапраме такую канструкцыю называюць «паслядоўны гібрыд», тлумачыць генеральны канструктар. Менавіта на такія машыны ўстанаўліваюць зялёныя нумары, падкрэсліваючы іх экалагічнасць, і пазіцыянуюць як новае слова ў машынабудаванні. Між тым, расказаў Аляксандр Наскавец, «паслядоўны гібрыд» БЕЛАЗ прыдумаў яшчэ ў 1967 годзе і выпускае самазвалы з электрамеханічнай трансмісіяй дагэтуль.

— Другі кірунак — чыста электрычныя самазвалы, — працягвае начальнік НТЦ. — Выраблены два доследныя ўзоры рознай грузападымальнасці, з акумулятарнымі батарэямі, цяпер яны праходзяць выпрабаванні на заводскім палігоне.

І яшчэ адзін экалагічны кірунак — выкарыстанне вадароду ў якасці паліва.

Ну, а галоўны трэнд у машынабудаванні — вядома ж, рабатызацыя.

— Мы працуем і ў гэтым кірунку, — кажа суразмоўца. — І сёння ў нас ужо чацвёртая ітэрацыя робатаў.

Першы быў самазвал з дыстанцыйным кіраваннем, другі і трэці — ужо цалкам рабатызаваныя машыны. Усе тры распрацоўкі — сумесны праект з расійскімі спецыялістамі. Сёння БЕЛАЗ у супрацоўніцтве з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі стварыў цалкам беларускага робата. Два беспілотныя БЕЛАЗы больш ранніх мадыфікацый ужо працуюць у кар'ерах Хакасіі, а два новыя робаты грузападымальнасцю 90 тон у хуткім часе адправяцца ў Брэсцкую вобласць, на радовішча Сітніцкае.

## ЖОЎТЫЯ ГІГАНТЫ

Захапляючыся вытанчанымі абрысамі еўрапейскіх, японскіх і амерыканскіх аўтамабіляў, мы не ведаем, што менавіта БЕЛАЗ стаў сусветным заканадаўцам мод у дызайне буйнагабарытных машын: паклаў пачатак трэнду, актуальнаму да гэтага часу. Вядомы ва ўсім свеце дызайн БЕЛАЗа быў створаны ў 1960-я.



— Для тых часоў гэта было нешта незразумелае: ламаныя лініі, кабіна збоку, — расказвае генеральны канструктар.

Але тыя, хто разумее, адразу ж ацанілі прыгажосць і функцыянальнасць. Трэнд падхапілі і японцы, і амерыканцы.

— Мы прэзентавалі БЕЛАЗ-540 у 1961 годзе, Caterpillar паказаў падобны дызайн у 1962-м, Komatsy — у 1963–1964-м, — кажа Аляксандр Наскавец.

З тых часоў аблічча БЕЛАЗаў змянялася і дапрацоўвалася, захоўваючы «аўтэнтычныя» рысы.

Зразумела, што такія машыны праектуюць для інтэнсіўнай работы і высокай нагрузкі ва ўмовах бездарожжа і агрэсіўнага асяроддзя. Відавочна, што галоўныя параметры для іх — грузападымальнасць, надзейнасць, праходнасць, здольнасць бяспечна і эфектыўна транспартаваць вялікія аб'ёмы горных парод. І ўсё ж немалаважны аспект — камфорт кіроўцы.

